*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 34 (465) | Серада, 22 лістапада 1961 г. | Цана 1 кап.

*З намі гавораць дэлегаты гістарычнага з'езда*

## Наша светлая будучыня

Зала клуба імя Дзяржынскага перапоўнена. Студэнты, аспіранты, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна сабраліся сюды на сустрэчу з дэлегатам XXII з'езда КПСС сакратаром ЦК КПБ Васілём Філімонавічам Шаура.

Сакратар парткома БДУ Р. В. Булацкі адкрывае сход.

—Адбыўшыйся з'езд, — пачаў сваё выступленне тав. Шаура, — мае велізарнае гістарычнае значэнне. XXII з'езд падвёў вынікі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне і прыняў новую Праграму партыі, Праграму будаўніцтва камунізма ў СССР. Гісторыя, працягвае дакладчык, яшчэ не ведала такога з'езда. Каля пяці тысяч лепшых сыноў і дачок народа прадстаўлялі на з'ездзе амаль дзесяцімільённую армію камуністаў толькі нашай краіны. Дэлегаты васьмідзесяці камуністычных і рабочых партый зарубежных краін прынялі ўдзел у рабоце з'езда будаўнікоў камунізма.

Неабходна адзначыць, гаворыць тав. Шаура, выключны дэмакратызм у рабоце з'езда. Кожнаму дэлегату, кожнаму замежнаму прадстаўніку была дадзена поўная магчымасць выказаць усё, што той лічыў неабходным. Матэрыялы з'езда поўнасцю друкаваліся ў газетах. Вялікая ўвага была ўдзелена выкрыццю вынікаў культу асобы Сталіна. Цяпер жа кіруе краінай, партыяй савецкі ўрад і ленінскі ЦК на чале з верным і паслядоўным ленінцам Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым, чалавекам, які добра ведае жыццё, добра разбіраецца ва ўсіх пытаннях унутранага і міжнароднага становішча. Нормы ленінскага жыцця, якія былі парушаны ў час культу асобы, цяпер поўнасцю адноўлены.

З'езд яшчэ раз прадэманстраваў маналітную згуртаванасць Камуністычнай партыі вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта, адобрыў правільнасць лініі XX з'езда КПСС. Дэлегаты горача падтрымалі палітычны курс і практычную дзейнасць ЦК КПСС у галіне знешняй і ўнутранай палітыкі ў сучасны момант.

Тав. Шаура падрабязна расказаў аб поспехах нашай рэспублікі ў развіцці народнай гаспадаркі, аб паўсямесным перавыкананні планаў у гонар XXII з'езда КПСС.

У заключэнне сакратар ЦК КПБ тав. Шаура пажадаў прысутным поспехаў у далейшай рабоце, вучобе, у барацьбе за ператварэнне ў жыццё велічных ідэй XXII з'езда, Праграмы будаўніцтва камунізма ў нашай краіне. «Няма больш пачэснай задачы для кожнай камсамольскай і партыйнай арганізацыі як данесці да мас рашэнні з'езда. XXII з'езд КПСС абвясціў міру аб тым, што Савецкі Саюз выйшаў на новы рашаючы этап у гісторыі чалавецтва. З кожным годам, з кожным днём усё лепш прыгажэй і багацей будзе наша жыццё».

Гэтыя словы тав. Шаура былі сустрэты дружнымі апладысментамі.

Выступае прафесар Дзмітрый Аляксеевіч Супруненка.

— Ні адзін з'езд, мы можам смела сказаць гэта, не вызваў у нашых сэрцах, у сэрцах мільёнаў працоўных такіх радасных пачуццяў. Планы партыі — нашы планы. Наша задача — выканаць рашэнні партыі ў імя працвітання нашай вялікай, цудоўнай Радзімы.

На трыбуне студэнтка філфака Галіна Булкіна:

— Мы з вялікай увагай сачылі за работай з'езда, чыталі яго матэрыялы. Мы, студэнты, усім сэрцам падтрымліваем мерапрыемствы партыі і ўрада, выдатнай вучобай адказам на клопаты краіны аб нас. Мы далучаем свае галасы да галасоў дэлегатаў па ўсіх пытаннях, якія разглядаліся на з'ездзе.

Выступае прафесар Віктар Рыгоравіч Заўрыеў.

— Думкі перапаўняюць нас настолькі, што цяжка выразіць. Няма ніякага сумнення ў тым, што прадвызначэнні партыі на дваццаць год будуць выкананы і перавыкананы. Цяпер жа трэба пранікнёна вывучаць новыя Праграму і Статут партыі. Прафесарска-выкладчыцкі састаў геафака прыступіў ужо да іх вывучэння.

— Вялікая любоў партыі да людзей нараджае ў нашых сэрцах любоў у адказ, — так сказала студэнтка хімфака Мардзінцава.—Камунізм — гэта сцяг, шчасце, крылы чалавека. Няхай жа чалавек будзе навечна шчаслівым!

І. М. Лушчыцкі гаворыць аб тым, што ва універсітэце хутка пачнецца, ды і пачалося ўжо, вывучэнне матэрыялаў XXII з'езда.

Сакратар парткома БДУ Рыгор Васільевіч Булацкі запэўніў, што ўсе вучоныя універсітэта прымуць самы дзейсны ўдзел у барацьбе за пабудову камунізма ў нашай краіне, за далейшы пад'ём вучэбнай, выхаваўчай, навуковай работы ва універсітэце.

Васіль Філімонавіч Шаура адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.

## *Нам будаваць камунізм. Нам жыць пры камунізме!*

*Пасля заняткаў студэнты і выкладчыкі гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў сабраліся ў актавай зале гуманітарнага корпуса. Усе з нецярпеннем чакалі выступлення дэлегата XXII з'езда КПСС, першага сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Максімава. Паяўленне яго на трыбуне прысутныя сустрэлі апладысментамі.*

*— Нельга перадаць усю атмасферу з'езда, тыя ўражанні, якія пакінуў ён у душы кожнага дэлегата. Гэтыя дні і гістарычныя рашэнні з'езда пройдуць праз гады і стагоддзі, знамянуючы сабой новы этап у гісторыі чалавецтва,— сказаў тав. Максімаў.*

*— Камуністычным Маніфестам нашай эпохі назвалі нашу новую Праграму кіраўнікі брацкіх Камуністычных партый. І гэта сапраўды так. Зараз позіркі людзей усяго свету накіраваны да нашай краіны, да нашага народа, які праз 20 год прыдзе да камунізма,— працягвае дакладчык.*

*Далей тав. Максімаў гаварыў аб тым, што нам, камсамольцам выпала шчасце будаваць новае грамадства і трэба кожнаму зрабіць усё магчымае, каб наблізіць светлую будучыню чалавецтва, у адным страі з усім народам змагацца за выкананне велічных задач, пастаўленых партыяй.*

*З гневам і абурэннем гаварыў дэлегат аб культе асобы і адшчапенцах-фракцыянерах. Ен прывёў некалькі прыкладаў расправы Маленкова над лепшымі партыйнымі кадрамі ў Беларусі.*

*Усім вядома імя Веры Харужай, якой пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Палымяная патрыётка сваёй Радзімы, адна з першых кіраўнікоў камсамола ў заходніх вобласцях Беларусі, камуністка, якая да канца была адданай справе рэвалюцыі і сацыялізма, была абвінавачана ў шпіянажы ў карысць адной з замежных краін. У жніўні 1937 года яна была арыштавана і пасаджана ў турму. Два гады цягнулася дазнанне. На судзе Вера Харужая сказала:*

*— Я застануся такой, якая я ёсць цяпер, бо я веру партыі, веру ў справу рэвалюцыі.*

*У тыя гады быў абвінавачаны ні ў чым не павінны першы сакратар ЦК камсамола Беларусі тав. Касыраў.*

*Мы падтрымалі дэлегатаў, якія патрабавалі выключэння Молатава, Маленкова, Кагановіча і іншых з партыі і за прыцягненне іх да адказнасці.*

*Далей тав. Максімаў гаварыў аб тым маналітным яднанні камуністаў усяго свету, якое паказаў з'езд.*

*— У яднанні наша сіла. Гэта залог таго, што мы пабудуем камунізм. І моладзь, як заўсёды, будзе ў першых радах будаўнікоў камунізма.*

*Тав. Максімаў адказаў на шматлікія пытанні прысутнічаючых.*

### Прафсаюзная канферэнцыя

**19 лістапада адбылася агульнауніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя. Канферэнцыя заслухала і абмеркавала даклад старшыні прафкома БДУ А. Цалко, справаздачу праўлення клуба, рэвізійнай камісіі, выбрала новы прафком універсітэта, а таксама дэлегатаў на абласную прафсаюзную канферэнцыю.**

**Матэрыялы з канферэнцыі чытайце ў наступным нумары нашай газеты.**



Сесія прыдзе хутка! Студэнтка хімфака Нэла Калеснікава пачынае ўжо рыхтавацца да экзаменаў.
НА ЗДЫМКУ: Н. Калеснікава ў лабараторыі.
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

## Універсітэцкая хроніка

19 лістапада споўнілася 250 год з дня нараджэння геніяльнага рускага вучонага Міхаіла Васільевіча Ламаносава. Гэтай падзеі было прысвечана пасяджэнне Вучонага Савета БДУ, якое адбылося ў пятніцу, 17 лістапада.

— — —

У верасні студэнты пятага курса геаграфічнага факультэта зрабілі вялікае падарожжа па роднай краіне. Аб усіх этапах яго расказваюць цікавыя фотаздымкі, прадстаўленыя на стэндзе, арганізаваным у хімкорпусе.

— — —

Выстаўка, прысвечаная 250-годдзю з дня нараджэння М. В. Ламаносава, адкрыта ў біякорпусе. На ёй прадстаўлены кнігі і часопісы розных аўтараў і розных гадоў выдання, у якіх расказваецца аб жыцці і дзейнасці вялікага вучонага.

Такая ж выстаўка адкрыта ў корпусе гуманітарных факультэтаў

### Чакаем вашых пісем

**Дарагая рэдакцыя! Было б добра, калі б гэта пісьмо было надрукавана. Мы павінны пачаць на старонках нашай газеты вялікую, задушэўную размову аб будаўніку нашага камуністычнага заўтра. Я думаю, што размова на гэтым не спыніцца, нашы студэнты адгукнуцца на пісьмо і расказкуць аб сваіх таварышах, аб іх імкненнях і марах.**

## ПЛЯЧО КАЛЕКТЫВА

КАЛІ Гена Г. прыйшоў ва універсітэт, усё яму здалося новым, цікавым: студэнты і выкладчыкі, лекцыі і семінары. Яму хацелася вучыцца. Студэнты выказалі сваё давер'е і паваГу да яго, калі на першым жа сходзе абралі прафгрупоргам. Здавалася б, што яшчэ трэба чалавеку? Вучыся, апраўдвай давер'е таварышаў. Але не! Узносы ён збіраць ленаваўся. А прафсаюзныя білеты абменьваў больш чым паўгода. Прафсаюзная работа яму не пайшла на карысць. Таварышы па вучобе рабілі выгляд, што нічога дрэннага ў гэтым няма. Сябры не жадалі псаваць адносіны з Генадзем.

— Рэкі пачынаюцца з ручайкоў, — гаворыць народная прымаўка. Пайшлі пропускі лекцый. Адзін раз яму захацелася паглядзець новы фільм, другі раз проста не захацелася ісці на заняткі, трэці раз была цікавая сустрэча па футболу. Камсамольцы курса прынялі выгляд назіральнікаў. Камсорг Ніна А. на заўвагі аб тым, што трэба было б разабрацца ягo паводзіны на сходзе, адказала:

— Не ўмешвайцеся не ў свае справы. Самі разбярэмся.

І разабраліся! У час летняй экзаменацыйнай сесіі выкладчыца замежнай мовы ледзь-ледзь паставіла яму залік з умовай, што на другім курсе Гена возьмецца за справу.

Пачаўся новы вучэбны год, але Гена не зрабіў ніякіх вывадаў з мінулага. Ён працягваў прапускаць лекцыі і семінары. Таварышы, якія былі побач з ім у інтэрнаце, «спалі ў шапку». А на курсе ніхто не здагадаўся сказаць Гену па-камсамольску, у вочы ўсю праўду. Камсамольцы на чале з камсоргам не праявілі сапраўднага пачуцця сяброўства і калектывізма, не ўказалі своечасова на памылкі таварыша. Пасіўнасць і раўнадушша прывялі да таго, што ў час зімовай сесіі Гена атрымаў «незалік» па замежнай мове і вымушаны быў пакінуць курс таму, што быў не дапушчаны да здачы экзаменаў.

А ён мог бы быць сёння сярод нас, калі б камсамольская арганізацыя трэцяга курса рускага аддзялення была больш баявой, калі б камсамольцы курса больш цікавіліся справамі сваіх сяброў, калі б кожны быў за ўсіх, а ўсе за аднаго.

Добра, калі ты не адзін, калі адчуваеш плячо калектыва. Не страшны тады ніякія нягоды. Вось гэтага пляча, на якое ў цяжкую хвіліну можна было б абаперціся, і не хапіла Гену. А шкада, і вінаваты ў гэтым камсамольцы.

Чалавек павінен быць лепшым, ён можа быць лепшым, ён абавязан быць лепшым. Мы павінны жыць не толькі для сябе, думаць не толькі аб сабе, а клапаціцца аб усенародным багацці, уседамляючы, што мы карысны грамадству, што мы ўпрыгожваем жыццё сваёй дзейнасцю, сваімі паступкамі.

(Заканчэнне на 2-ой стар.)



*У трэцекурснікаў фізічнага факультэта ў лабараторыях пачаліся мантажныя работы. Мы прысутнічалі на адным з такіх заняткаў і былі прыемна здзіўлены. Студэнты Аляксей Клімовіч і Міхаіл Глінскі сабралі двухлямпавы радыёпрыёмнік з сілкаваннем ад электрасеткі за . . . 30 мінут. Праўда, пры зборцы юнакі выкарыстоўвалі некаторыя гатовыя вузлы, што значна паскорыла іх работу. Але каб прышлося збіраць і больш складаныя схемы, то і тады хлопцы не разгубіліся б. А гэта гаворыць аб іх грунтоўных багатых ведах.*

*Лабарант Давід Аронавіч Таўмін сказаў аб Яўгену Каратаеву, якога вы бачыце на здымку, вельмі мала, але пераканаўча:*

*— Дасканала валодае студэнт прыборамі. Работы выконвае вельмі добра. Вось і цяпер яго мантажная работа заслугоўвае высокай адзнакі.*

*І гэта сапраўды так.*

**Фота Л. Кузьміцкага і Ч. Якубовіча.**

Чакаем вашых пісем

# ПЛЯЧО КАЛЕКТЫВА

(Заканчэнне).

Аляксей Максімавіч Горкі пісаў: «Найлепшая пасада быць на зямлі чалавекам!» Ён меў на увазе, вядома, добрага чалавека. Добры... Ці можна так казаць аб чалавеку! Бо ў кожным ёсць і добрае, і дрэннае. Але ў адным больш дрэннага, а ў другім больш добрага. Вядома, што трэба ўсімі сіламі змагацца супраць дрэннага ў чалавеку. Дапамагчы яму, калі ён сам не можа адкінуць усё дрэннае, пакінуць толькі добрае, камуністычнае. Вялікая роля ў гэтым належыць нашым камсамольскім арганізацыям.

Выпадак з Генадзем вельмі сумны і кладзе пляму на ўсю нашу камсамольскую арганізацыю. Але мы, як сапраўдныя камсамольцы, не павінны закрываць на гэта вочы. Лепш горкая праўда, чым прыгожая мана. Такія памылкі ў камсамольскай рабоце не павінны паўтарыцца.

А вось як паступілі ў мінулым годзе камсамольцы сёняшняга 4-га курса рускага аддзялення. За нядобрасумленныя адносіны да работы камсамольская арганізацыя курса вынесла рашэнне: прасіць рэктарат аб выключэнні з універсітэта Лены Емельянавай, Ларысы Камцавай тэрмінам на адзін год. Вярнуцца ў свой калектыў яны могуць пры ўмове, што папрацаваўшы на прадпрыемстве, яны чэснай працай заробяць добрыя характарыстыкі і гэтым могуць акупіць сваю віну перад камсамольцамі курса.

Гэта своеасаблівая мера дала свае вынікі. Цяпер Лена і Ларыса займаюцца на трэцім курсе рускага аддзялення. У час работы ў калгасе яны былі ў ліку першых. Брыгадзір другой паляводчай брыгады калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя» М. Росцік быў задаволен іх сумленнай працай.

Гэты выпадак гаворыць аб вялікай выхаваўчай ролі калектыва, сапраўдных сяброў-камсамольцаў, правільна пастаўленай рабоце ў групе.

Хацелася б сказаць аб добрасумленых, свядомых, сапраўдных камсамольцах. Напрыклад, Іван Казак, студэнт 5 курса беларускага аддзялення. Пяць год жыве ён у інтэрнаце і ніколі за гэты час не адказаўся ад даручанай справы ці каменданта, ці камсамольскай арганізацыі. Студэнты М. Ястраб, Ю. Гукаў, У. Герасімаў, Я. Казюкін, хаця і на першым курсе, але яны па сапраўднаму апраўдваюць званне камсамольца. Яны ніколі не адкажуцца дапамагчы таварышу. Здаецца няма тут нічога асаблівага. Мы павінны гаварыць аб такіх вось, на першы погляд непрыкметных, справах.

Студэнт І курса фізічнага факультэта У. Капцюг знайшоў гадзіннік.

— Хто яго гаспадар? А мо забраць сабе? Не, гэта будзе не па камсамольску.

Гаспадар гадзінніка знайшоўся. Гэта быў Адам Капусцін, студэнт ІІ курса аддзялення журналістыкі. Як прыемна было ўручыць знаходку гаспадару! А магло б быць інакш... Вельмі прыемна адчуваць, што ты жывеш сярод добрых сумленных людзей, і гэта нашы камсамольцы, студэнты універсітэта імя У. І. Леніна.

І як непрыемна было пачуць на агульнаўніверсітэцкім сходзе аб тым, што студэнтка нашага факультэта Тамара Дарошка ўсяго два дні адпрацавала на будаўніцтве галоўнага корпуса, а студэнткі Люда К. і Тамара Р. нядобрасумленна аднесліся да працы ў калгасе, спазняліся, або зусім не выходзілі на работу.

Чалавек заўтрашняга дня не так павінен адносіцца да працы. Праца павінна стаць першай неабходнасцю кожнага свядомага чалавека, а ў камуністычным грамадстве несвядомых не будзе, ды і не возьмем мы з сабой туды гультаёў.

Вельмі прыемна адчуць локаць свайго сябра, магутнае плячо калектыву.

Анатоль Піскуноў, студэнт ІІ курса, не бачыць. Яму вельмі цяжка займацца, але сяброўская дапамога А. Юдэнкі, А. Гамоліна, У. Уласава, якія жывуць побач з ім, дапамагаюць яму пазбавіцца ад адзіноты. Ён чуе і нават бачыць гэту бескарысную дапамогу сяброў. Студэнты па чарзе чытаюць Анатолю новы матэрыял, часопісы, газеты. Экзамены ён здаў паспяхова.

Пачуццё калектывізма, узаемавыручкі, своечасовай дапамогі таварышу, сумленнасць — вось асноўныя якасці будаўніка камуністычнага грамадства. Знаходзячыся сярод нашых студэнтаў, мімаволі думаеш, што прынцыпы маральнага кодэкса будаўніка камунізма, правілы: чалавек чалавеку сябра, таварыш і брат — цвёрда ўваходзяць у наша жыццё.

**АНАТОЛЬ СТРЫЖЭВІЧ,**
**сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.**

АД РЭДАКЦЫІ. Надрукаваўшы пісьмо А. Стрыжэвіча, у якім ён падымае вельмі важнае пытанне аб чалавеку будучага, аб нашым сучасніку, таварышу, рэдакцыя звяртаецца да ўсіх студэнтаў універсітэта прыняць удзел у размове, у дыскусіі аб маральным обліку камсамольца, студэнта. У сваім пісьме А. Стрыжэвіч прывёў рад прыкладаў з жыцця, вучобы і адпачынку студэнтаў універсітэта. Колькі такіх прыкладаў навокал. Пішыце нам аб гэтым. Пішыце аб добрых справах нашых студэнтаў, не маўчыце і аб дрэнных учынках, перажытках, недахопах! Ці правільна думае А. Стрыжэвіч, што прынцыпы маральнага кодэкса будаўніка камунізма ўжо цвёрда ўваходзяць у наша жыццё? А як думаеце вы?

# Фізкультура і спорт

## Юбілейнае першынство

Закончылася юбілейнае першынство БДУ па шашках, прысвечанае 40-годдзю універсітэта, у якім прымалі ўдзел мацнейшыя шашысты рэспублікі. Майстры спорту Плакхін і Файнберг, першаразраднікі Спірыдонаў, (педінстытут) і Клебанаў (медінстытут), Драбушэвіч і Лесіна (БДУ) і іншыя на працягу месяца змагаліся за званне пераможцы турніра.

З першага тура ўперад выйшаў майстар спорту Плакхін і не ўступіў лідэрства да канца турніра. Набраўшы 11,5 ачкоў, ён заняў першае месца. Другое месца падзялілі Файнберг і Драбушэвіч. Добра выступіла Лесіна. Нядрэнна выступілі і другія ўдзельнікі турніра.



Валя Гаварытава—першакурсніца з матэматычнага факультэта, а Валя Лук'янава—студэнтка філфака. На турніры першакурснікаў дзяўчаты пасябравалі і цяпер іх нярэдка можна ўбачыць разам, нізка схіліўшыхся над шахматнай дошкай.

**Фота Г. КРУГЛОВА.**

## Валейбалісты выступілі дрэнна

29 кастрычніка і 2 лістапада ўпершыню ў гэтым навучальным годзе памераліся сіламі з мацнейшымі калектывамі ВНУ нашы валейбалісты і валейбалісткі. Яны выступалі па першай групе на першынстве сярод ВНУ.

Ад універсітэта выступалі чатыры каманды. Найбольш удала правялі турнір другая жаночая каманда, перамогшая ў абедзвюх сустрэчах. Першая жаночая выйграла ў БПІ і прайграла ІФК. Дрэнна выступілі мужчыны. Яны не перамаглі ні ў адной сустрэчы.

З 26 лістапада пачынаецца клубнае першынство горада, у якім будзе прымаць удзел 8 калектываў. Будзем спадзявацца, што прайшоўшы турнір будзе добрым урокам для нашых валейбалістаў і яны змогуць паказаць добрую зладжаную гульню.

**М. ШАРУБА,**
**(наш. кар.).**

## ЗНАЁМЦЕСЯ: *нашы цяжкаатлеты*



Чатыры разы ў тыдзень зал, адведзены для заняткаў секцыі цяжкай атлетыкі, займаюць члены зборнай універсітэта. Па дзве і больш гадзіны спартсмены шліфуюць сваё майстэрства.

Каманда цяжкаатлетаў неаднаразова ўдзельнічала ў розных спаборніцтвах і дабівалася добрых вынікаў. У гэтым годзе на першынстве рэспублікі сярод студэнтаў нашы спартсмены занялі другое месца, прапусціўшы ўперад толькі калектыў інстытута фізкультуры.

У секцыі, якой кіруе Віктар Фёдаравіч Кавалёў, выхавана нямала спартсменаў-цяжкаатлетаў. Гэта Шаверын, Стронгін, Гімельштэйн і іншыя.

Уперадзе — шмат цікавых сустрэч на памосце, да якіх цяпер настойліва рыхтуюцца члены зборнай універсітэта.

**Э. ЯСНЫ.**

На здымку: зборная каманда цяжкаатлетаў універсітэта.

**Фота В. ЖУРАЎЛЕВА.**

## Міхась Знак: ВЕРШЫ

### ЦІХА ПЛАЧА РУЧЭЙ

Ціха плача ручэй,
Б'е слязою срабрыстай.
У зярнятах вачэй
Дзіўны промень іскрысты,
Тонкі бэзавы пах
Ад шаўковай касынкі,
Восень тчэ ў валасах
Сівізны павуцінкі.
Мне б цябе, як раней,
Прыгарнуць аж да сэрца,
Цалаваць бы мацней,
Тваім подыхам грэцца,
І пачуццяў раку
Выліць магмай гарачай,
Шчыра ўзяць за руку
І спытаць: «Што ж ты плачаш?
Хіба ж я ў тым віной,
Што ў марознае ранне
З цветам яблынь вясной
Абляцела каханне?»
Я ж не веру, што ты
Пакахала другога,
Што згубіла між тым
К майму сэрцу дарогу.
Ён адзін за дваіх
Словы сыпаў на вецер.
Трапятала ад іх
Абамлелае вецце,
Ціха ўсхліпваў ручэй,
Плыў слязою срабрыстай..
У зярнятах вачэй
Гасне промень іскрысты...

### ВОСЕНЬ

*Пад сонцам пабурэлі пашы,*
*Стагі высокія наўсцяж.*
*Прынесла восень вёсцы нашай*
*Свой падарунак у багаж.*

*Засекі поўныя пшаніцы*
*І кукуруза, быццам гай,*
*У садзе спрытна маладзіцы*
*Збіраюць яблык ураджай.*

*І стогне трактар неўгамонны,*
*Рыхтуе сілас на зіму,*
*Гляжу на ўсё, пяшчоты поўны,*
*І сэрцу радасна майму.*

*Імкнуцца думкі міма волі.*
*Я з тым хачу спаткацца днём,*
*Калі ўладар шчаслівай долі*
*Узніме камунізма дом.*

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

Наш адрас:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон 2-07-19.
Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.
АТ 06723 Зак. 2369